# РАЗДЗЕЛ 11

# Медыяадукацыя: методыкі, канцэпцыі і практыкі

**Лада Алейнік**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## САЦЫЯЛІЗАЦЫЯ ЧЫТАЧА ЯК АДНА З ГАЛОЎНЫХ ФУНКЦЫЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ

Працэс азнаямлення з літаратурнымі творамі – гэта адначасова працэс засваення маральных норм, іерархіі грамадскіх каштоўнасцей, стылю паводзінаў, увасобленых у сюжэтах і вобразах. Мастацкі тэкст няўхільна мадэлюе ў свядомасці чытача псіхалагічныя ўстаноўкі, якія ў пэўнай ступені каардынуюць яго зносіны з соцыумам. Інакш кажучы, мастацкая літаратура з'яўляецца эфектыўным сродкам сацыялізацыі асобы.

Вядома, што сацыялізацыя адбываецца на працягу ўсяго жыцця чалавека, складаецца з некалькіх этапаў, стадый. Самым значным этапам у станаўленні асобы з'яўляецца першасная сацыялізацыя, звязаная з перыядам дзяцінства. Менавіта надзвычайнай важнасцю сацыяльнай ролі мастацкай літаратуры ў жыцці юнага пакалення абумоўлены яе статус як школьнай дысцыпліны. Літаратура «прыняла на сябе ролю вядучага прадмета ў агульнай сістэме інтэлектуальнага і маральнага фарміравання школьнікаў, абуджэнні і развіцці іх самасвядомасці, здольнасцей, імкнення да самавыхавання. Яе вывучэнне разглядаецца як сродак фарміравання і гарманічнага развіцця асобы. Паколькі літаратура – гэта мастацтва слова, то, несумненна, вобразнасць – аснова яе мовы, таму сіла літаратурнага твора заключаецца ў стварэнні мастацкай карціны свету, уздзеянні на чытача вобразаў літаратурных герояў, якія робяцца для многіх прыкладам паводзінаў альбо, наадварот, антыгероямі. Адпаведна, у адрозненне ад іншых светапоглядных дысцыплін, літаратура заўжды была магутным сродкам сацыялізацыі» [2].

Апошняе дзесяцігоддзе ХХ – пачатак ХХІ ст. характарызуюцца кардынальнымі зменамі ў галіне літаратуры, адрасаванай аўдыторыі юных чытачоў. Істотна пашырыўся яе праблемна-тэматычны дыяпазон, заўважальным плёнам вызначыліся жанрава-стылёвыя пошукі, відавочна абнавіліся моўна-выяўленчыя сродкі. Першапрычынай тут



зрабіліся карэнныя зрухі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі канца 1980 – пачатку 1990-х гг. – перабудова, распад Савецкага Саюза, набыццё краінай статуса суверэннай дзяржавы, змена дзяржаўнай ідэалогіі, палітыка галоснасці, паслабленне цэнзурнага кантролю ў сродках масавай інфармацыі і ў літаратуры. Другім фактарам непасрэднага ўплыву на літаратуру зрабілася інтэнсіўнае развіццё інфармацыйных тэхналогій у канцы ХХ – пачатку ХХІ стст. Найноўшыя мультымедыйныя сродкі склалі беспрэцэдэнтную канкурэнцыю друкаваным выданням, але адначасова з'явіліся эфектыўным стымулам для развіцця мастацтва слова. Літаратуразнаўца І.Г. Мінералава падкрэсліла: «Адметнасць нашай эпохі, якую з цягам часу пачнуць называць эпохай памежжа ХХ–ХХІ стагоддзяў, заключаецца ў тым, што літаратура як адзін з найстарэйшых відаў мастацтва пастаўлена ў вельмі цяжкія, амаль невыносныя ўмовы выжывання такімі надзвычайна магутнымі інфармацыйнымі сістэмамі, якімі з'яўляюцца тэлебачанне і камп'ютэр з іх уяўна неабмежаванымі магчымасцямі «машыннай» творчасці» [3, с. 24]. Такім чынам, на парозе ХХІ ст. пісьменнікі апынуліся перад неабходнасцю пошуку арыгінальных сюжэтных ідэй і кампазіцыйнага афармлення мастацкіх узораў, новых выяўленчых прыёмаў і спосабаў эмацыйнага ўздзеяння на чытача. І думаецца, што сёння ёсць усе падставы гаварыць пра сур'ёзныя набыткі ў галіне беларускай літаратуры для дзяцей і падлеткаў.

Дзеля прыцягнення чытацкай увагі многія пісьменнікі звярнуліся ў сваёй творчасці да папулярных жанраў масавай літаратуры. Так, напрыклад, сюжэт аповесці Яўгена Хвалея «Прынцэса тусоўкі» (1990) заснаваны на дэтэктыўнай калізіі, аповесці Людмілы Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла» (2000) і «Пярсцёнак апошняга імператара» (2001) – на спалучэнні дэтэктыўнай інтрыгі з любоўнай гісторыяй, а ключавой падзеяй яе рамана «Гульня ў Альбарутэнію» (2012) зрабіўся адмысловы прыём «падарожжа ў часе». Асноватворнымі падзеямі аповесцей Андрэя Федарэнкі «Шчарбаты талер» (1999) і «Афганская шкатулка» (2002) сталі захапляльныя прыгоды і пошук скарбаў. Анатоль Казлоў у аповесці «Дзеці ночы» (2000) апелюе да містыкі, Алесь Наварыч у аповесці «Пакланюся Перуну, памалюся Вялесу…» (2008) выкарыстоўвае элемент містыфікацыі, Раіса Баравікова ў аповесці «Казімір – сын Ягайлы + Насця з 8 «б» = каханне» (2008) спалучае тры эпохі і стварае фантастычную рэальнасць. У аповесці Алеся Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» (2008) гаворка ідзе пра недаравальную памылку ў паводзінах героя, якая пацягнула за сабой непапраўныя наступствы. Несумненна, ва ўсіх гэтых творах актуалізуюцца найперш пытанні маралі, увага аўтараў скіравана на вытлумачэнне грамадскіх каштоўнасцей,

этыкі ўзаемаадносінаў, чалавечай прыстойнасці і годнасці, але дыдактызм твораў невідавочны, ён замаскіраваны ў вострасюжэтных перыпетыях і займальных прыгодах, выхаваўчыя тэзы завуаляваны ў дыялогах і ўнутраных маналогах герояў.

А вось мастацкая канцэпцыя аповесці Валерыя Гапеева «Ведзьміна тоня» істотна адрозніваецца ад іншых твораў – тут няма ні злачынстваў, ні скарбаў, ні містыфікацый. Аўтар у першую чаргу засяроджваецца на сённяшняй рэчаіснасці, актуалізуе надзённыя праблемы сучаснага жыцця. І ў той жа час аповесць напоўнена ўражлівымі фактамі, мае востры сюжэт, які палоніць фактычна з першых эпізодаў.

Найперш варта засяродзіць увагу на адной з кампазіцыйных асаблівасцей твора, якая адыгрывае ў сюжэце немалаважную ролю. Асноўным падзеям папярэднічае пралог, дзе часткова вытлумачваецца сутнасць загадкавай назвы твора: “Чорнае люстэрка свабоднай вады, на выгляд неверагодна халоднай нават у спякотны дзень. Калі залезці на якую алешыну, дык зверху Ведзьміна тоня выглядае раўнюткім кругам, а вада ў ёй – яшчэ чарней. Вядома ж, торф на дне. Хоць што там, на дне – ніхто не ведае, бо купацца тут не будзеш: адсюль, з вострава, бераг злёгку абрывісты, скочыш – вада па калені, але потым пачынае імкліва засмоктваць ногі. Пяць хвілін прастаіш – і па пояс ужо схаваешся. Не хопішся за што, не вылезеш” [1, с. 4]. Такое вось «гіблае месца» Ведзьміна тоня. Варта адзначыць, што яшчэ не пазнаёміўшы чытачоў з героямі, не акрэсліўшы ніякай падзейнай лініі, ужо ў пралогу аўтар стварае інтрыгу, канцэнтраваную атмасферу тайны, выклікае прадчуванне небяспекі. Спрыяюць гэтаму найперш эпізоды, дзе ўвасоблены мясцовыя паказкі ды даўнішняе змрочнае паданне пра падступнасць «чорнай вады». «Некалі прыезджыя гарадскія спрабавалі з лодкі ставіць на Ведзьмінай тоні сеткі. То раніцай не змаглі ні адну выцягнуць – гэтулькі карчагаў на дне. А яшчэ раней, расказваюць, невядомы рыбак на маленькай гумавай лодцы плаваў па тоні некалькі дзён – ад вострава да вострава. Ні з кім не размаўляў, твар ад людзей хаваў. Адкуль ён і хто – не ведалі. Некалькі дзён бясшумна яго лодка слізгала па чорнай вадзе. А аднойчы ён не паказаўся. Толькі лодку гумавую, пустую, без вёслаў прыбіла бліжэй к зіме да Заікінага вострава. А сам рыбак згінуў. Вось з той пары ён часам паказваецца тым рыбакам, што на лодках спрабуюць па тоні плаваць. Просіцца ў лодку – моўчкі з вады цягне рукі…» [1, с. 4–5]. Як бачна, тут спалучаецца рэалістычнае і містычнае, рамантычнае і нават драматычнае. Яшчэ большай загадкавасці Ведзьмінай тоні надае аповед-прыпавесць аднаго са старэйшых жыхароў вёскі – дзеда Васіля, – які расказвае, «што стаяў тут раней лес, а сярод гэтага лесу быў хутар. Жыла ў ім жанчына, вядзьмарка. І гэтак яна многа шкоды нарабіла людзям, што Бог не стрываў, і ў адну ноч праваліўся гэты кавалак лесу пад зямлю. Вось верхавіны дрэў з-пад вады і чапляюцца за сеткі ды за плаўцоў. А сама вядзьмарка і цяпер уладарыць у Ведзьмінай тоні і вакол яе, хаваецца на астравах» [1, с. 5].



Аднак асноўная падзейная лінія, што далей развіваецца ў творы, фактычна ніяк не звязана з пралогам. Увага аўтара канцэнтруецца на асобе падлетка Сяргея, які прыехаў на лета ў вёску з інтэрната. Тут найперш насцярожвае, як варожа сустракаюць хлопчыка мясцовыя жыхары. Па дарозе да хаты яго суправаджаюць зласлівыя размовы вясковых кабет, дзе гучыць, што і вочы ў Сяргея «зладзеяватыя», і што «дзэтдом добраму не навучыць», і ўвогуле ён «бандыт бандытам»… Аўтар выкарыстаў вельмі ўдалы прыём дзеля «рэкамендацыі» персанажа. З аднаго боку, падлетка пэўным чынам характарызуюць водзывы староннiх людзей, а з другога – яго ўласныя ўнутраныя маналогі, паводзіны, мысленне, рэакцыя на пачутыя рэплікі, і толькі ў апошнюю чаргу – каментары апавядальніка, дзе найбольш аб’ектыўна вытлумачваюцца абставіны жыцця юнага героя: «Калі табе чатырнаццаць і калі з гэтых чатырнаццаці палову – сем гадоў – бавіш у школе-інтэрнаце 10 месяцаў у годзе, ты навучышся не зважаць на з’едлівыя слоўцы. Ты наагул многаму навучышся. Навучышся хаваць крыўду і слёзы. Навучышся трываць боль, голад, не баяцца холаду. Навучышся біцца – так, каб неабавязкова перамагчы, а толькі ўратаваць сябе ці сябра. Навучышся ўцякаць, хавацца, маўчаць. <…> Сяргей добра засвойваў усе навукі, якія даваў яму гэты адасоблены свет няшчасных аднолькава, ды злых па-рознаму дзяцей-сіротаў» [1, с. 7]. Ужо адно гэтыя факты, датычныя лёсу хлопчыка, абвастраюць эмоцыі, прыцягваюць увагу да яго асобы. Але тыя падрабязнасці, што выяўляюцца ў сюжэце далей – страта бацькі, дэградацыя маці, колішнія жахлівыя абставіны існавання ў роднай хаце – кранаюць насамрэч да глыбіні душы, выклікаюць шчырае суперажыванне юнаму герою, балючае ўсведамленне яго фізічных і маральных пакутаў. А ў канчатковым выніку пісьменнік разгортвае перад чытачом драматычны малюнак жыцця адной сям’і з катэгорыі тых, што ў сучасным грамадстве называюць па-рознаму – ці праблемнымі, ці недабранадзенымі, ці асацыяльнымі.

Бацька Сяргея загінуў, калі хлопчык толькі нарадзіўся, маці амаль адразу прызвычаілася да пляшкі. Вядома, што дзеці часта захоўваюць у памяці асабліва яркія ўражанні ці пачуцці, перажытыя ў першыя гады жыцця. Найчасцей – гэта радасныя ўспаміны пра сямейныя святы, падарункі бацькоў, ласункі. У Сяргея было іншае «незабыўнае» пачуццё – пачуццё неадступнага і вострага голаду: «Яно было заўсёды, мо з

самага першага для яго жыцця, яно не знікала ніколі, яно толькі спала разам з Сяргеем і прачыналася разам з ім. <…> Голад не знікаў ніколі. Яго не магла прагнаць звараная і патоўчаная свіная бульба, якую ён у маленстве краў у суседкі, бабулі Адар'і, голад толькі прыціхаў ледзь-ледзь, калі маці прыносіла (але як рэдка прыносіла!) дадому свежы хлеб, і Сяргей прыпадаў ваўкавата да адламанага кавалка, пах якога раздзіраў ноздры. Сяргей прыехаў у інтэрнат з гэтым пачуццём, худы, невысокі для свайго ўзросту і з пукатым выродлівым жыватом. За першы год у інтэрнаце ён з'еў столькі, колькі, можа, не з'еў за свае першыя сем год жыцця» [1, с. 8–9].

Гэты аўтарскі каментар адыгрывае істотную ролю ў сюжэце. Па-першае, пісьменнік вытлумачвае, якім чынам хлопчык набыў рэпутацыю «злодзея». Па-другое, – стварае аб'ектыўнае разуменне далейшых дзеянняў і пачуццяў Сяргея – калі яго маці нарадзіла яшчэ адно дзіця. Сяргею на той час было дзевяць гадоў, і ён сам быў здольны пра сябе паклапаціцца. А вось маленькая сястрычка – зусім бездапаможная. Яна ўвесь час плача, і хлопчык з болем разумее, што дзіця пакутуе ад голаду, − ад таго самага, ад якога пакутаваў ён сам. Справядліва кажуць, што сыты галоднага не разумее. Але Сяргей з уласнага вопыту ведае, што адчувае маленькая Анжэла (ці Нэла, як завуць дзяўчынку ў вёсцы), і знаходзіць адзіны шлях, каб ратаваць дзіця ад пакутаў: «Гэта для яе, Анжэлы, краў ён у суседніх куратніках яйкі, капаў на чужых агародах раннюю бульбу (свая зарастала пустазеллем, паспявала позна), лазіў па трускалкі, агуркі, яблыкі. Для яе мінулым летам цікаваў і схапіў быў белы бохан проста з машыны, калі выгружалі ў краму хлеб. А неяк нават надаіў ад нечае казы кубак малака…» [1, с. 10]. Праз гэта ўсё і пайшла пра Сяргея погаласка, як пра злодзея і бандыта. Неабходна заўважыць, што ні сам герой, ні аўтар-апавядальнік нідзе нікога не абвінавачваюць – ні ў зласлівасці, ні ў чэрствасці, ні ў абыякавасці. Аднак у час азнаямлення з сюжэтам кожны чытач няўхільна апынецца перад пытаннем: няўжо староннія дарослыя, суседзі-аднавяскоўцы не бачылі, як жывецца хлапчуку, а пазней – і яго маленькай сястрычцы? Няўжо ў іх душах нічога не варухнулася, калі яны бачылі пакуты дзяцей? Безумоўна, Валерый Гапееў наўмысна падштурхоўвае, падводзіць чытача да асэнсавання падобных пытанняў, вымушае рабіць пэўныя высновы.

І побач паказвае, што на самой справе свет не без добрых людзей; яны ёсць – чулыя да чужога болю, спагадлівыя, міласэрныя. Адной з такіх гераінь з'яўляецца, напрыклад, інтэрнацкая паварыха цётка Соня, якая, пабачыўшы прагнасць Сяргея да ежы, разумеючы, якое жыццё было ў дзіцяці «ў сям'і», пачынае апекавацца хлапчуком: «Яна, цётка Соня, з худым, высахлым тварам і з чырвонымі, нечакана шырокімі і тоўстымі пальцамі рук, якія ўсё хавала пад фартух, прыносіла з дому яйкі і смажыла для Сяргея і яшчэ для аднаго хлопца, жаўтушнага Міцькі, яечню з малаком, пякла дранікі і цішком частавала іх у сваёй бакоўцы» [1, с. 9]. Уважліва ставіцца да Сяргея і выхавальніца, якая адпраўляе хлопчыка на лета дадому, збірае не толькі гасцінцы для яго самога, але і прысмакі, і такую-сякую вопратку для Нэлы. Толькі вось, на жаль, Сяргею быццам бы не надта шанцуе на такіх людзей… А можа не? Можа, хлопчыку гэта толькі здаецца? Відаць, на пошук адказаў на гэтыя пытанні далей накіроўвае пісьменнік свайго чытача.



Сюжэт аповесці В. Гапееў выбудоўвае такім чынам, каб на першым плане знаходзіліся паказальныя факты і з'явы, якія непасрэдна ўплываюць на паводзіны і светаасэнсаванне галоўнага героя, арыентуюць яго ў прыняцці пэўных рашэнняў. Да іх ліку, напрыклад, належаць эпізоды, дзе адлюстравана жыццё сястрычкі Сяргея – малюнкі, якія выклікаюць жах і абурэнне, шчымлівае суперажыванне маленькаму безабароннаму дзіцяці, агіду да дарослых людзей, якія страцілі чалавечы воблік. Маці прывяла ў хату прымака – «былога зэка, п'яніцу і лайдака», і «брыдкія лаянкі і бойкі сталі ў Сяргеевай хаце звычайнай з'явай». «Калі прымак быў не надта п'яны, ён пачынаў выхоўваць Нэлу. Яго выхаванне больш нагадвала звычайную дрэсіроўку якога-небудзь звярка – ён біў дзяўчынку, калі тая не слухалася і даваў кавалачкі хлеба, калі яго каманды выконваліся» [1, с. 13]. Дзяўчынка перастала размаўляць, ператварылася ў маўклівую запалоханую істоту. Сяргей, прыехаўшы з інтэрната, знаходзіць брудную недагледжаную сястрычку прывязанай за нагу да грушы ў двары, побач «стаяла пластыкавая бутэлька з вадой, ляжалі высахлы на сонцы кавалак хлеба і тры звараныя з лупінамі бульбіны» [1, с. 12]. Ёмістая выразнасць гэтых эпізодаў пераканаўча ілюструе ўсю звыродлівасць «бацькоўскага клопату» пра дзіця, наглядна дэманструе іх нялюдскі лад жыцця.

Унутраны свет падлетка выяўляецца ў аповесці найперш праз яго адносіны да малодшай сястры. Менавіта клопат пра дзіця вымушае Сяргея пачувацца дарослым, дужым, адказным, стымулюе да актыўных дзеянняў. Цэлы шэраг выразных, па-мастацку красамоўных эпізодаў адлюстроўвае змены ў свядомасці хлопчыка. Гэта і супрацьстаянне «прымаку», калі Сяргей, баронячы сястрычку, хапаецца за вілы, і майстраванне будана ў садзе, каб не начаваць пад адным дахам з «зэкам» і не назіраць п'яных дэбошаў, і пошук ужо не крадзенай спажывы, а сумленнага заробку.

Драматызм становішча Сяргея і Нэлы адчуваецца асабліва глыбока, калі аўтар знаёміць чытачоў з іншымі вясковымі дзецьмі – чатырнаццацігадовымі двайнятамі Віцькам і Жэнькай з сям'і мясцовых настаўнікаў, Віталем – з сям'і трактарыста і даяркі, Эдзікам – мінскім падлеткам, што прыязджае ў вёску да бабулі на канікулы. Усе гэтыя дзеці жывуць у атмасферы ўтульнасці, яны ахутаны клопатам і шчырай любоўю родных. Пісьменнік не абыходзіць увагай і той факт, што ў гэтых дзяцей – свае, адпаведныя ўзросту інтарэсы: Жэнька вырошчвае ружы, яе брат Віцька захапляецца камп'ютарам, Віталь – вялікі аматар картаскладання. Умовы жыцця вясковых падлеткаў з добраўпарадкаваных сем'яў рэзка кантрастуюць з умовамі існавання Сяргея і Нэлы, абвастраюць разуменне абдзеленасці апошніх.

Аповесць мае надзвычай канцэнтраваную фабулу. Тут нельга абмінуць увагай ніводзін эпізод, ніводзін факт, бо ў кожным – свой рацыянальны сэнс: істотная дэталь, штрых да партрэта кагосьці з персанажаў, матывацыя ўчынка. Гэта датычыцца, напрыклад, гісторыі супрацьстаяння Сяргея і яго вясковых аднагодкаў. Аўтар не толькі дэманструе канфлікт падлеткаў з-за «рыбнага месца» на копанцы, вынікам якога стала жорсткая бойка, але адначасова адлюстроўвае перажыванні вялікай колькасці герояў, што маюць прамое ці ўскоснае дачыненне да падзей. Тут выяўлены і прыкрасць Віцькі – пераможцы ў бойцы, які не адчувае ніякай радасці ад сваёй перамогі, і здрадлівы спалох Эдзіка, і шырокі дыяпазон пачуццяў Сяргея – ад балючага ўсведамлення ўласнай бездапаможнасці і прагі помсты да валявога падаўлення ўласнай агрэсіі: «Гады, сволачы! Пачакайце, я разберуся, я з вамі з кожным паасобку разберуся!» – думкі пра адплату тлумілі розум. <...> Віцька ў вёсцы жыве – і выдатна, хлеў падпаліць можна, каб ведалі! А таму гарадскому так твар распісаць кавалкам шкла, каб на ўсё жыццё засталося... <...> Але недзе ў галаве жыла і іншая думка – тая самая клятва самому сабе, што даў ён за месяц да сваіх вакацыяў, што нараджалася пакутліва, выспявала пакрысе і стала яго праграмай дзеяння: не плач, не бойся, не прасі. І яшчэ дадатак – не крадзі. <...> Будзеш красці – будзеш сядзець у вязніцы. <...> А Сяргею за краты нельга – у яго ёсць Нэла. І яшчэ... Яшчэ ён помніў словы сваёй маладой выхавацелькі: «Яны там у вёсцы лічаць цябе дрэнным, бо ты крадзеш. Вось паспрабуй не скрасці. Змяніся сам – і пагляндзі, ці зменіцца свет...» [1, с. 61–62].

Шлях, на які ступіў Сяргей, складаны. Прыняць рашэнне «не красці» – гэта адно. А як жыць? На якія сродкі? Пісьменнік дэталёва вымалёўвае, як крок за крокам, баязліва і няўпэўнена, падлетак намацвае сцежку новага жыцця. Цалкам зразумела, чаму першы, да каго ён



звяртаецца па дапамогу, гэта дзед Васіль: «Ні дзед Васіль, ні старая Адарка, вядома ж, за год не змаглі забыць, як лазіў у іх сад па «залатыя ранеты» Сяргей, як спрытна ўначы з-пад самага акна выбіраў апошнія трускалкі. Адно дадавала смеласці – тое, што ўчора дзед заступіўся за Сяргея і Нэлу перад гэтым зэкам» [1, с. 44]. Так, менавіта заступніцтва дзеда Васіля дае хлопчыку падставы спадзявацца, што стары адгукнецца і на гэты раз. Але Сяргей звяртаецца не з просьбай, не з «працягнутай рукой», ён прапаноўвае дапамогу ў працы. Вось у гэтым эпізодзе, у дыялогу герояў аўтар з дакладнай тонкасцю адлюстраваў унутраны стан юнага героя, неверагоднае напружанне, хваляванне, нават страх:

« – Добры дзень, памагай Бог, – хутка выпаліў Сяргей, падышоўшы бліжэй. – Я вось за леташнія яблыкі разлічыцца прыйшоў. Ну, і, можа, зараблю на паданкі крыху, як паспеюць, а?..

Ён сказаў гэта быццам і абыякавым тонам, але ўнутры сцяўся – што адкажуць?

– То чаго стаў? – дзед Васіль размерана махаў граблямі, збіраючы сена ў валок, дадаў спакойна, як пра раней дамоўленае: – Давай, станавіся перад бабай. Яна за табой заграбе.

«Цьфу ты, як проста», – Сяргей адчуў незвычайную палёгку. Рукі вось толькі крыху трымцелі, зубы вілаў чапляліся за зямлю, але ўжо праз хвілін пяць праца пайшла спорна» [1, с. 44–45].

Аўтар доказна, выразнымі фактамі пераконвае: добрых людзей значна больш, чым злых і чэрствых; на самой справе ўсё вельмі проста – трэба толькі самому быць сумленным і шчырым, тады і да цябе паставяцца адпаведна.

Пераканаўча адлюстравана ў аповесці, як няпроста завязвалася сяброўства Сяргея з аднагодкамі, як пераадольваліся супярэчнасці былых канфліктаў і наладжвалася паміж імі згода, як выспельвалася задума сумеснага падарожжа на Ведзьміну тоню.

Кампазіцыю аповесці можна ўмоўна падзяліць на дзве часткі. У першай увага акцэнтуецца на быце Сяргея і Нэлы, у другой дамінуюць абставіны падарожжа на Савіны востраў. Прыгоды, што напаткалі юных герояў у час «дэсанту» на востраў, дэманструюць, як аб'ядноўвае сапраўдная справа, якой магутнай сілай з'яўляецца сяброўства. Пад кіраўніцтвам дзеда Васіля падлеткі правялі сапраўднае следства і высветлілі абставіны геройскай гібелі ў гады вайны чатырох сваіх аднавяскоўцаў.

У аповесці па-мастацку адлюстраваны працэс сацыялізацыі падлетка, выяўлена псіхалогія і матывацыя яго ўчынкаў, патлумачаны агульны лад мыслення. Юныя чытачы, якім адрасаваны твор, натуральным

чынам далучаюцца да асэнсавання праблем, з якімі сутыкаецца герой, суперажываюць яму, няўхільна прымаюць менавіта яго бок у складаных сітуацыях, бо герой выклікае павагу, яго паводзіны справядлівыя, годныя.

Каштоўнасць аповесці В. Гапеева – у асаблівай, маральнай увазе да чалавека, у гуманістычным падтэксце, які сцвярджае перавагу дабра ў нашым жыцці, у свеце, ва ўзаемаадносінах людзей.

*Літаратура*

1. Гапееў, В.М. Ведзьміна тоня / В. Гапееў. – Мінск: Маст. літ., 2012. – 294 с.

2. Касьянюк, Т.Н. Социокультурный потенциал литературы в процессе модернизации общего образования / Т.Н. Касьянюк [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/sotsiokulturnyi-potentsial-literatury-v-protsesse-modernizatsii-obshchego-obrazovaniya – Дата доступа: 14.01.2014.

3. Минералова, И.Г. Детская литература: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений. – М: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2002. – 176 с.